Аддзел адукацыі, спорту і турызму
Ваўкавыскага раённага
выканаўчага камітэта
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці
№ 7 г. Ваўкавыска»

# Праект

# “У гасцях у беларускай казкі”




Распрацавала:
Кур’ян В.Н.,
выхавальнік
дашкольнай
адукацыі
вышэйшай
катэгорыі

***Любіце беларускія казкі, любіце мову, на якой яны напісаны. Цаніце гэты вялікі народны скарб. Бо ён дапамагае быць сціплым, разумным, спагадлівым, удзячным…***

**Вольга Кур'ян**

# Тэматычныя дні праекта



# Праект “У гасцях у беларускай казкі”

| Тып праекта | тэматычны |
|---|---|
| **Мэта** | Фарміраванне у выхаванцаў інтарэсу да гісторыі сваёй краіны, народнай творчасці, традыцый і звычаяў беларусаў праз знаёмства з беларускай казкай |
| **Задачы** | Фарміраваць уяўленні дзяцей аб нацыянальных асаблівасцях беларускага фальклору, традыцыях народа, прадметах нацыянальнага быту, народных звычаях<br>Садзейнічаць далейшаму практычнаму аваладванню мастацка - маўленчай дзейнасцю, далучэнню да тэатральна - гульнёвай дзейнасці<br>Развіваць уменні сумесна з дарослым, прыдумваць казку, прымаць удзел у падрыхтоўцы спектакля як акцер, афарміцель сцэны<br>Развіваць уменні перадаваць у ролі настрой, характар і вобраз персанажа, самастойна весці сваю ролю у пастаноўцы казкі<br>Развіваць цікавасць да фальклору і беларускай мовы, узбагаціць слоўнікавы запас дзяцей народнымі прымаўкамі, жартамі<br>Выхоўваць праз беларускую народную казку пачуццё любові да роднага краю і гонару за яго<br>Выхоўваць сяброўскія ўзаемаадносіны паміж дзецьмі, звярнуць увагу на маральныя якасці беларуса: дабрыню, спагадлівасць, працавітасць, гасціннасць, сумленнасць; выхоўваць у дзяцей жаданне быць разумным, смелым, знаходлівым, суперажываць і спачуваць |
| **Мяркуемыя вынікі** | Дзеці ведаюць і распазнаюць беларускія казкі, з задавальненнем слухаюць казкі у выкананні дарослых, адрозніваюць казкі ад іншых літаратурных жанраў, прымаюць удзел у складанні казак, выкананні роляў персанажаў па матывах беларускіх казак,могуць даць ацэнку дзеянням герояў казкі. |
| **Актуальнасць** | Беларуская народная казка – найбольш эфектыўны сродак выхавання і навучання дзіцяці роднай мове ў дашкольным узросце. Праз яе дзіця далучаецца да мастацкіх вытокаў беларускай мовы, роднага слова, да пазнавання свету не толькі розумам, але і сэрцам. Яна ўмацоўвае ў дашкольнікаў веру ў шчаслівае жыццё, вучыць марыць, уяўляць, развіваць творчыя здольнасці. |

| | |
|---|---|
| | У казках адлюстроўваецца барацьба за справядлівасць, мары аб лепшым жыцці. Беларускія народныя казкі ў большасці сваёй вызначаюцца высокай мастацкасцю, вострай крытычнай накіраванасцю супраць сацыяльнай несправядлівасці.<br>“Па жывасці і прыгажосці расказа беларускія казкі не маюць сабе роўных” – ацэнка даследчыка фальклору С.У Саўчанкі.<br>Беларускія народныя казкі – найлепшы прыклад формы расказвання на роднай мове. Праз перажыванні, выкліканыя казкамі, у дзяцей развіваецца жаданне браць прыклад з разумных, смелых, знаходлівых. |
| **Метадычнае забеспячэнне праекта** | **Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі** / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. — 408 с.<br>**Пралеска: группа «Фантазеры». Хрестоматия** : пособие для педагогов учреждений дошк. образования : в 5 ч. / сост. :А. И.Саченко, Л. А. Саченко. — Минск : Нац. ин-т образования, 2011.<br>**Дубініна, Д. М. У свеце казак** : вучэб. нагляд. дапаможнік для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з беларускай мовай навучання / Д. М. Дубініна. — Мінск : Пачатковая школа, 2013. — 12 с. — (Серыя «Свет дзяцінства»). |
| **Рэсурснае забеспячэнне праекта** | Ілюстрацыйны матэрыял, малюнкі дзяцей і бацькоў, дэкарацыі, касцюмы для пастановак беларускіх казак, кніжкі – самаробкі з беларускімі казкамі, кніжкі – размалёўкі, слайды з выявамі міфалагічных герояў і інш. |
| **Удзельнікі праекта** | Выхавальнікі, выхаванцы, бацькі выхаванцаў, педагог – псіхолаг, педагог сацыяльны, кіраўнік фізічнага выхавання, музычны кіраўнік, памочнік выхавальніка |
| **Працягласць праекта** | 16 – 27 лістапада 2015 |
| **Абагульненне праекта** | Сумеснае свята “У гасцях у беларускай казкі” з усімі удзельнікамі рэалізацыі праекта |

# Узаемадзеянне з сем'ямі выхаванцаў па рэалізацыі праекта

1. Афармленне кніжак - самаробак "Беларускія казкі".
2. Конкурс - агляд сямейнай творчасці "У гасцях у беларускай казкі" (малюнак, аплікацыя, калаж і інш.).
3. Анкетаванне бацькоў "Казка ў жыцці дзіцяці".
4. Кансультацыя па выніках анкетавання бацькоў "Роля казкі ў жыцці дзіцяці".
5. Тэатр аднаго акцёра (паказ казкі) "Жаронцы" – Кавалевіч Ю.Ю. (тата Мікіты.)
6. Абмен вопытам па далучэнню дзяцей да беларускай казкі (прагляд сямейных відэазапісаў).
7. Дабрачынная акцыя "Падары казку дзецям".
8. Папаўненне сюжэтна - ролевай гульні "Бібліятэка" беларускай чытанкай (казкі).
9. Інфармацыйны лісток "Чытайце дзецям казкі".
10. Дапамога бацькоў у складанні зборніка размалёвак "Героі беларускіх казак".
11. Дапамога бацькоў ў афармленні дэкарацый да спектакля (казка "Баран-бок абадран").
12. Афармленне складанак "Мае любімыя казкі".
13. Індывідуальная кансультацыя "Фальклор і развіццё маўлення (сям'я Арсенія).
14. Выраб міфалагічных герояў.
15. Сумеснае свята "У гасцях у беларускай казкі" з усімі удзельнікамі рэалізацыі праекта.

# Рэалізацыя праекта
# праз спецыяльна арганізаваную дзейнасць

| Дні тыдня | Спецыяльна арганізаваная дзейнасць |
|---|---|
| **Панядзелак** | 1. Мастацтва. Музычная дзейнасць. Спяванне беларускіх заклічак, прыпевак, прыдумванне танцавальных рухаў, мелодый да любімай казкі “Муха-пяюха”.<br>2. Дзіця і прырода. Загадкі Лесавічка.<br>3. Фізічная культура на вуліцы. “Горкай, горкай, горачкай” – падарожжа ў краіну беларускіх гульняў. |
| **Аўторак** | 1. Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін. Гульня – занятак “Героі беларускіх казак”.<br>2. Мастацтва. Лепка. “Коцік” (па матывам беларускіх народных казак).<br>3. Фізічная культура ( з уключэннем казачнага героя “ката-Катафеіча”). |
| **Серада** | 1. Элементарныя матэматычныя ўяўленні. Гульнявы комплекс “Краіна казак”.<br>2. Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін. “У гасцях у казкі “ (сустрэча з новай казкай”Як кот звяроў напалохаў”).<br>3. Мастацтва. Музычная дзейнасць. Знаёмства з беларускімі народнымі інструментамі. |
| **Чацвер** | 1. Навучанне грамаце. Гукавы аналіз слова “Ліса”<br>2. Мастацтва. Маляванне (сюжэтнае) “Лісіца – хітрыца” (па казках “Лісіца-хітрыца, “Як кот звяроў напалохаў”).<br>3. Фізічная культура. Спаборніцтва “Асілкі” (міфалагічныя героі) . |
| **Пятніца** | 1. Інтэгрыраваны занятак “Казачная хатка” (Дзіця і грамадства. Мастацтва (маляванне, аплікацыя, канструяванне)<br>2. Фізічная культура (занятак з Несцеркам) |

# Рэалізацыя праекта праз цэнтры дзейнасці




## Цэнтр дзейнасці "Знайка" (развіццё маўлення і культура маўленчых зносін, дзіця і прырода, дзіця і грамадства)

Чытанне беларускіх народных казак па выбару дзяцей.

Складаем казку разам (прыдумванне пачатку і заканчэння да беларускай народнай казкі "Баран-бок абадран").

Завочнае падарожжа па старонках беларускіх казак (гульня-падарожжа).

Знаёмства з міфалагічнымі героямі (Вадзянік, Дамавік, Лясун, Кікімара з выкарыстаннем слайдаў.

Гутарка "Казка-найбагацейшы скарб".

Расказванне беларускай народнай казкі "Каток- залаты лабок" (на новы лад).

Экскурсія ў чытальную залу дзіцячай бібліятэкі.

Гульня-падарожжа "Сустрэча з любімай казкай"(казка "Пра быка і яго сяброў").

Праблемна- пошукавыя сітуацыі "А што было б, калі…?"

Расказ казкі па малюнках ("Як курачка пеўніка ратавала"), інсцэніраванне казкі "Баран-бок абадран".

Дыдактычныя гульні "Складзі казку", "З якой казкі?" (пазлы, цацкі, малюнкі).

Чытанне казкі на новы лад (па аднаіменнай казцы "Муха-пяюха"). Гутарка "Адкуль прыйшла казка?". Складанне прыпевак, жартаў пра казачных герояў (коцік, пеўнік, лісічка, воўк).

Дыдактычная гульня "Знайдзі і назаві казку па апісанні падзей. Гульнявыя творчыя заданні "Краіна казак і прыгод".

Дыдактычная гульня "Добры, дрэнны" (характарыстыка казачных герояў; фланелеграф, чорны кружок( - ), чырвоны кружок ( + ).

Літаратурная віктарына па старонках беларускай казкі. Клуб вясёлых і знаходлівых "Беларуская народная казка"

Гульня "Казачная блытаніна", "У гасцях у Несцеркі" – пагуляем, адгадаем (беларускія народныя казкі "Зайкава хатка", "Каза- манюка,"Муха-пяюха", "Сынок - з - кулачок").

Складанне партрэта, апісанне героя беларускіх казак (герой групы – Кот Катафей).

Складанне казкі з новымі героямі "Верабей і мыш".

Дыялог-гутарка за круглым сталом "Калі б героі казак жылі ў сучасным свеце"...(абмеркаванне па крузе).

Гульня "Пераўтваралкі". Гульнявыя сітуацыі –дапаможам пеўніку, курачцы, Пiлiпку.

Складанне фантастычных казак з беларускімі казачнымі героямі (кот Максім, Гарошак).
Падарожжа у чароўну краіну “Вяселка”(прэзентацыя часопіса “Вясёлка”)

**Цэнтр дзейнасці**
**“Юны артыст” – мастацтва (музыка, тэатральна - маўленчая дзейнасць)**




Тэатральная хвілінка - чытанне ўрыўка з казкі, абыгрыванне казачнага героя, інсцэнізацыя ўрыўка з казкі,
спяванне беларускіх заклічак, чытанне і абыгрыванне пацешак.
Праслухоўванне беларускай народнай музыкі. Спяванне прыпевак,прыдумванне мелодыі, танцавальных рухаў.
Работа над пастаноўкай беларускай народнай казкі “Баран - бок абадран” (чытанне казкі, абыгрыванне герояў казкі).
Час тэатра – “Казкі з куфэрка бабулі” (знаёмства з новай казкай “Лёгкі хлеб”, “Верабей і мыш”).
Успомнім казку (паказ сцэнак да любімых беларускіх казак “Зайкава хатка, “Пшанічны каласок”, “ Муха-пяюха”, “Пых” і інш.).
Сюжэтна-гульнявая праграма “У гасцях у беларускай казкі” (па сюжэту беларускай народнай казкі “Як курачка пеўніка ратавала”).
Музычная забава “Муха-пяюха” на новы лад.
Тэатр на фланелеграфе “Коцік, пеўнік і лісіца”.
Тэатр на ліпучках “Муха-пяюха. Настольны тэатр “Пра быка і яго сяброў”

**Цэнтр дзейнасці**
**“Вясёлы аловак” - мастацтва (маляванне, лепка, аплікацыя)**




Беларуская маляванка (па казцы “Пых”, пацешцы “Пайшоў коцік на масток і інш.)
Калаж “Героі любімых казак”.
Разглядванне ілюстрацыі да беларускай народнай казкі “Баран – бок абадран”(слайды).
Лепка па матывах беларускай народнай казкі.
Складанне кніжкі-размалёўкі “Казка за казкай”(размалёўкі казачных герояў, казачных эпізодаў).
Сюжэтнае маляванне па задуме “Мае любімыя казкі”.
Размалёўванне адзення для галоўных персанажаў казкі “Коцік, пеўнік і лісічка”.
Карагод беларускай казкі (нетрадыцыйным шляхам- аплікацыя , маляванне, лепка) – да выставы.
Выраб дэкарацыі да казкі “Зайкава хатка” (акцыя “Дзень важных і добрых спраў”) – старэйшыя - малодшым.
Аплікацыя дэкаратыўная па уяўленні“Героі нашых любімых казак”.

Дыдактычная гульня “Дамалюй” (па казцы “Пчала і муха”, Муха-пяюха”).
Творчыя заданні: заштрыхуй сінім колерам тых, каго ў казцы высмеялі, пакаралі,чырвоным тых, хто добры і працавіты
(па казцы “Пшанічны каласок”)
Разглядванне ілюстрацыйнага матэрыялу “Народная цацка – люстэрка культуры” (міфалагічны герой - асілак).
Лепка дэкаратыўная па ўзору “Збаночак”– з салёнага цеста.
Выставы творчасці дзяцей з прыкметамі адоранасці “Таямнічы і чароўны казачны свет”, “Мая любімая казка”.
Разглядванне ілюстрацый А.Лось да беларускіх народных казак “Два маразы”, “Залатая яблынька”




**<u>Цэнтр дзейнасці “Мазайка”</u>**
Дыдактычныя гульні:
-“Раскладзі па росту”;
- “Палічы”;
- “Хто лішні”;
- “Назаві герояў казкі” (хто схаваўся?)
Выкладванне з геаметрычных фігур
(героі казак, казачны лес).
Выкладванне з лічыльных палачак (казачная хатка, казачныя героі – ліса, верабей, мыш, коцік, пеўнік).
Гульнявы комплекс “У госці да ката Катафеіча”
Прайдзі па лабірынце:
- дапамажы Коціку дагнаць Лісічку;
- дапамажы Пеўніку выйсці да хаткі;
- які казачны герой прыйшоў да нас у госці?.




**<u>Цэнтр дзейнасці “Выпрабавальнікі” (пазнавальна – практычная і элементарная працоўная дзейнасць)</u>**
Разглядванне ільну, саломкі,
параўнанне вырабаў з ільну, саломкі.
Знаемства з інтэр’ерам сялянскай хаткі (ілюстрацыйны матэрыял, разглядванне прадметаў сялянскага побыту – форма, колер, матэрыял).
Сумесная праца дзяцей з дарослымі:
-падрыхтоўка касцюмаў для інсцэніравання казкі“Баран – бок абадран” (наведванне касцюмернага пакою, адбор касцюмаў,чыстка, прасаванне, развешванне і інш.);
-навядзенне парадку ў тэатральным куточку;
-аднаўленне лялек, лялечнага адзення, пераапрананне ў казачных персанажаў.

## Цэнтр дзейнасці “Сям’я” (сюжэтна – ролевыя гульні)




Сюжэтна – ролевая гульня “Бібліятэка”.
Сюжэтна – ролевая гульня “Сям’я” (сумеснае чытанне беларускай народнай казкі “Пра быка і яго сяброў”).
Гульня з пераапрананнямі “Адгадай, з якой я казкі?”
Рэжысёрская гульня “Я – артыст!”

## Цэнтр дзейнасці“Будаўнік” (канструктыўная дзейнасць)




“Казачны лес” (канструяванне з прыроднага матэрыялу).
Канструяванне і дзіцячы дызайн “Святочная каробачка” (з паперы)
Будаўнічая гульня “Я – будаўнік”
“Казачная хатка” (канструяванне з паперы).
Канструяванне па узору “Баран (прыродны матэрыял) – па казцы “Баран-бок абадран”. Канструяванне з паперы “Выраб какошніка”.
Дзіцячы дызайн “Сумачка для ўнучкі” (казка “Пых”) - папера.
Разглядванне карцінак з адлюстраваннем гарадскіх і вясковых жылых пабудоў (знаёмства з архітэктурай).
Канструяванне з прыроднага матэрыялу, паперы (“Верабей і мыш”- беларуская народная казка).

## Цэнтр дзейнасці “ Здаравячок” (фізкультурна-аздараўленчая і гульнёвая дзейнасць)




“У гасцях у Несцеркі” ( развучванне беларускай народнай гульні “Ходзіць ліска ля ваконца”, правядзенне гульняў “Заінька”, “Казёл”, “Мядзведзь”), спаборніцтва “Асілкі”, спартыўна – тэатральная забава “Пакліч у госці казку”.
Спартыўна-тэатральная казка “Збанок – церамок”.
Сцяжынка перашкод(з уключэннем героя праектаКата Катафеіча)
Вяселая ранішняя гімнастыка з героямі беларускіх казак

**<u>Дадатак 1</u>**

# *Сумесная творчасць выхавальніка і выхаванцаў:*

## *прыдумванне пачатку і заканчэння казкі*

### Беларуская народная казка “Баран – бок абадран”.

***У адным сяле, не важна дзе, жылі-былі дзед і баба, і быў у іх баран. Ды такі гарэзлівы, упарты, барадаты і калхматы, а самае галоўнае, усіх пужаў, выхваляўся сваёю сілаю, задаваўся. Надаела гэта дзеду і бабе, і вырашылі яны зарэзаць гэтага барана.***

Толькі пачаў дзед рэзаць, трошкі бок абадраў, ажно баран ускочыў ды ўцёк і схаваўся ў нару лісіцы.

Прыйшла лісіца ў сваю нару, а там нехта сядзіць. Спужалася лісіца і пытаецца:

- Хто там?

А баран ёй:

- Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, як дам рагамі, дык ты дагары нагамі.

Лісіца спужалася і пайшла ваўка прасіць:

- А воўчанька ты мой, а кумочак мой, хадзі дапамажы маёй бядзе, паглядзі, хто гэта ў маёй нары сядзіць.

Паслухаў воўк лісу, пайшоў з ёй у нару выганяць барана : прыйшоў ды сарп, сарп, носам нюхае:

- Хто там?

- Я тут, баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, як дам рагамі, дык ты дагары нагамі.

Воўк спужаўся і ўцёк. Пайшлі яны з лісіцай да мядзведзя, сталі мядзведзя прасіць:

- Мядзведзенька, бацюхна, хадзі дапамажы нашай бядзе, паглядзі, хто ў лісіцынай нары сядзіць.

Паслухаў мядзведзь, пайшоў з імі да нары і пытаецца:

- Хто там?

А баран яму:

- Я тут, баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, як дам рагамі, дык ты дагары нагамі.

Мядзведзь спужаўся і ўцёк. Ідуць яны, ідуць каля саду і бачаць, ляціць пчолка. Давай яны пчолку прасіць:

- Пчолачка,душачка, хадзі паглядзі, хто ў лісіцынай нары сядзіць.

Паляцела з імі пчолка. Прыляцела і пытаецца:

- Хто там?

- Я тут, баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, як дам рагамі, дык ты дагары нагамі.

***Падляцела пчолка да нары, як загудзе:***

***- Жу-жу-жу, барана пасаджу на качаргу, дзеда бачу за вярсту, барана шукае, зарэзаць яго абяцае.***

***Спужаўся баран, высунуў галаву з лісічкінай нары, а пчала яго як пачала кусаць за абадраны бок, і так, і сяк. Баран ледзь дух пераведў, уцякаў, уцякаў, а там і ножку сваю зламаў.***

***А дзед тут як тут. Пашкадаваў барана, забраў назад у свой двор. Але с той пары баран перастаў выхваляцца сваёю сілаю і задавацца.***

***І мы там з вамі былі, барана бачылі, але не спужаліся. Весяліліся, скакалі, ажно ногі загулі. Смяяліся, спявалі, рагаталі, аж жывоцікі надрывалі.***



**<u>Дадатак 2</u>**

# Літаратурная віктарына па старонках беларускіх народных казак.

**Задачы:** удакладніць і абагульніць уяўленні пра беларускія народныя казкі; развіваць уменні называць казку па малюнках, па казачных героях, па прачытанаму ўрыўку, па вокладцы; развіваць уменне ацэньваць учынкі герояў, выказваць свае адносіны да іх; развіваць цікавасць дзяцей да беларускай мовы, яе вобразнасці, прыгажосці; выхоўваць любоў да сваёй краіны, свайго народа.

**Прадметнае асяроддзе:** беларускі нацыянальны касцюм (жаночы), аўдыёзапіс "Беларуская народная музыка", карта Беларусі, ілюстрацыі казачных эпізодаў, шырма для тэатра, цацкі: баран, лісічка, мядзведзь, воўк, малюнкі да казкі "Як курачка пеўніка ратавала"; разразная карцінка "Кот", разразныя малюнкі курачкі, індыка, гусака, наклееныя на кубы; фланелеграф з малюнкамі (каток, курачка, пеўнік, зайчык, мужык, воўк, гусак, індык).

Выхавальнік. Пачынаюцца нашы казкі, заплятаюцццa нашы казкі…

Дзеці, запрашаю вас апынуцца ў чарадзейнай краіне казак. Казкі – гэта найбагацейшы скарб. У іх людзі выказвалі свае думкі пра шчасце, пра лепшае жыццё. Беларускія народныя казкі складаліся не адным чалавекам, перадаваліся ад дзеда ўнуку, ад унука- праўнуку. Беларускія народныя казкі ведаюць у многіх краінах свету. Яны перакладзены на польскую, нямецкую і іншыя мовы.

А вы, дзеткі, добра ведаеце беларускія народныя казкі? Ну дык, паспаборнічаем!

(гучыць беларуская народная мелодыя, дзеці становяцца ў круг, танцуюць "Польку – весялуху")

Пытанні:

1. Хто ведае прыгожую назву нашай краіны? (Беларусь)
2. Як называюцца людзі, якія жывуць на Беларусі? (беларусы)
3. Як называецца народны лялечны тэатр? (батлейка)
4. Яе ўсе баяцца трошкі, яна ў лесе мае хатку на курыных ножках і ў ступе лятае. Хто гэта? (Баба Яга)

(на мальберце ілюстрацыі казачных эпізодаў, дзе сустракаецца Баба Яга- "Гусі-лебедзі", "Піліпка сынок" і іншыя беларускія і рускія казкі (дзеці называюць казку "Піліпка сынок").

5. На якім дрэве сядзеў Піліпка сынок, хаваючыся ад Бабы Ягі? (Явар)
6. Тэатр лялек. Паказ урыўка казкі "Баран - бок абадран"). З якой казкі прыходзілі да нас героі?
7. "Успомнім казку" (па малюнках – паслядоўнасць падзей; раскласці малюнкі па парадку па казцы "Як курачка пеўніка ратавала").

**Вясёлая хвілінка:** (выхавальнік трымае ў руках куфэрак)
Лады – лады -- ладачкі
Слухалі мы казачкі.
Ключык, ключык залаты,
Дзверы чароўныя адамкні
І народную гульню падары.

**Беларуская народная гульня “Пляцень”**

8. Якія звяры спалохаліся ката, які адправіўся ў лес на паляванне? Як называецца казка? (“Як кот звяроў напалохаў”; воўк, мядзведзь, дзік - сякач, заяц – шарак)
9. Складзіце разразную карцінку. Хто ў вас атрымаўся? (кот) . Як называецца казка, дзе кот мае імя хлопчыка? (Кот Максім)

**Беларуская народная гульня “У ката”**

10. Як называецца птушка, якая ў беларускай народнай казцы “Верабей і мыш” стала служыць памочнікам у паляванні чалавеку? (сокал)
11. (“Незвычайныя кубікі” – паставіць па парадку, пачынаючы ад лічбы “1”, і ўбачыць, што атрымаецца (складваюць курачку, гусака і індыка) З якой казкі гэтыя героі? ( “Пшанічны каласок”)
12. Як называецца казка, дзе два звяры яб’явілі адзін аднаму вайну? (“Сабака і воўк”)

Выхавальнік: - Дзеці, мы з вамі ўспомнілі беларускія народныя казкі, а яшчэ я думаю, вы ўжо зможаце адрозніць учынкі казачных герояў.

**Гульня “Чырвоны, чорны”** (на стале знаходзяцца героі казак, фланелеграф з выявамі чырвонага і чорнага кружкоў)

Заданне : герояў добрых, працавітых, разумных мы змесцім пад чырвоным кружком, а тых , каго ў казцы высмейвалі, пакаралі – пад чорным кружком (каток, курачка, пеўнік, зайчык, мужык; ліса, воўк, гусак, індык)

13. Супер - пытанне для пераможцы. Успомніце беларускі горад, назва якога нагадвае героя казак? (Ваўкавыск)

***Выхавальнік. Ну вось і закончылася наша падарожжа ў чарадзейную краіну казак. Вы мяне парадавалі, ведаеце шмат казак, добра размаўляеце на беларускай мове і за гэта вам падарунак (прэзентацыя кніжкі “Пшанічны каласок”, з ілюстрацыямі, творчымі заданнямі, зробленай рукамі таты Арсенія Якалцэвіча, Юрыем Станіслававічам Якалцэвічам).***

В.Н. Кур’ян, выхавальнік

**<u>Дадатак 3</u>**

## <u>Анкета для бацькоў</u>

# <u>*“Казка у жыцці дзіцяці”*</u>

***<u>Паважаныя бацькі!</u> Мы, дарослыя, абавязаны дапамагчы дзіцяці ўвайсці  у свет творчасці, фантазіі, ўяўленняў, даць магчымасць для найбольш поўнага развіцця, спрыяць выхаванню пачуццяў. Адным з важных шляхоў  пазнання рэчаіснасці з'яўляецца казка. Праз анкету нам хочацца даведацца аб ВАШЫХ адносінах да казкі ўвогуле і беларускай казкі непасрэдна як сродку выхавання і развіцця дзіцяці, аб ВАШАЙ ролі у выкарыстанні беларускай казкі як багацейшага скарба мудрасці, вопыту, роздуму, назіранняў і пазнанняў чалавека. Пры жаданні можна напісаць сваё прозвішча***

**1.Ці лічыце ВЫ неабходным чытаць або расказваць дзецям дашкольнага ўзросту казкі?**

- так;
- не

**2.Ці расказвалі ВАМ казкі ВАШЫ бацькі?**

- заўседы;
- зрэдку;
- не

**3.Ці чытаеце (расказваеце) ВЫ сваім дзецям казкі?**

- часта;
- зрэдку;
- не

**4.ВАШЫЯ адносіны да беларускай казкі:**

- station:
- адмоўныя;
- абыякавыя

**5.Ці ёсць у ВАШАЙ сямейнай бібліятэцы кніжкі казак?**

- так;
- не

**6.Ці есць у ВАШАЙ бібліятэцы кніжкі з беларускімі казкамі?**

- так;
- не

**7.Ці чытаеце ВЫ сваім дзецям беларускія казкі?**

- часта;
- зрэдку;
- не

**8.Чаму ВЫ больш аддаеце перавагу?**

- чытанню казкі;

- расказванню казкі
**9. Прачытаўшы казку, ВЫ:**
- адкладваеце кніжку ў бок;
- праводзіце гутарку;
- прапануеце што - небудзь намаляваць па прачытанай казцы;
- другое ________________________________________________
**10. Ці звяртаеце ВЫ ўвагу на выхаваўчы бок казкі?**
- заўседы;
- зрэдку;
- не
**11.Ці робіце ВЫ дома тэтральныя пастаноўкі па казках?**
- заўседы;
- зрэдку;
- не
**12. Напішыце, калі ласка, якая беларуская казка падабаецца:**
- ВАМ; ________________________________________________
- ВАШАМУ дзіцяці ________________________________________
**13.Ці размаўляеце ВЫ дома на беларускай мове?**
- заўседы;
- зрэдку;
- не
**14.Ці змаглі б Вы прыняць ўдзел у пастаноўцы беларускай казкі у нашай групе?**
- так;
- не
**15. Якую дапамогу Вы маглі б аказаць у стварэнні умоў для пашырэння знаемства з беларускай казкай?**
- стварыць кніжку – самаробку беларускіх казак;
- прачытаць дзецям у группе казку;
- падабраць малюнкі па казках;
- намаляваць казку;
- скласці сваю беларускую казку;
- скласці беларускую казку на новы лад:
- зрабіць складанку па казцы;
- аформіць кніжку размалёвак па беларускіх казках
- іншае ________________________________________________
**15.Ці хацелі б ВЫ больш глыбока даведацца аб тым, як можна выкарыстоўваць беларускую казку, і казку навогул, у развіцці дзіцяці?**
- так;
- не

***Вялікі дзякуй за шчырыя адказы***

В.Н. Кур'ян, выхавальнік,
Я.Б.Гаспадура, намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці

**Дадатак 4**

# Кансультацыя для бацькоў

# *“Роля казкі ў жыцці дзіцяці”*

Казка – адзін з важнейшых жанраў беларускай вусна-паэтычнай творчасці.

“Па жывасці і прыгажосці расказа беларускія казкі не маюць сабе роўных” – ацэнка даследчыка фальклору С.У Саўчанкі.

Беларуская народная казка – найбольш эфектыўны сродак выхавання і навучання дзіцяці роднай мове ў дашкольным узросце. Праз яе дзіця далучаецца да мастацкіх вытокаў беларускай мовы, роднага слова, да пазнавання свету не толькі розумам, але і сэрцам. Яна ўмацоўвае ў дашкалят веру ў шчаслівае жыццё, вучыць марыць, уяўляць, развіваць творчыя здольнасці.

Беларускія народныя казкі – найлепшы прыклад формы расказвання на роднай мове. Праз перажыванні, выкліканыя казкамі, у дзяцей развіваецца жаданне браць прыклад з разумных, смелых, знаходлівых.

Дашкольнае дзяцінства – залатая пара ў жыцці кожнага чалавека. Гэта самы спрыяльны час для выяўлення і развіцця патэнцыяльных задаткаў у дзіцяці, закладзеных прыродай.

Дзеці, выхаваныя на беларускіх народных казках, маюць больш багаты слоўнікавы запас беларускага маўлення, больш разумеюць родную мову, адчуваюць яе багацце, мілагучнасць, напеўнасць,каларыт і лепш ёю валодаюць.

Задача кожнага дарослага - дапамагчы дзіцяці ўвайсці ў свет творчасці, фантазіі, уяўленняў, даць магчымасць для найбольш поўнага яго развіцця.

Казкам належыць вялікая роля ў развіцці асобы дзіцяці. У кожнай казцы ёсць мараль, якая неабходна дзіцяці, так як яно павінна вызначыць сваё месца ў жыцці, засвоіць маральна-этычныя нормы паводзін у грамадстве.

Менавіта казка вучыць чалавека з самага маленства адрозніваць дабро ад зла, праўду ад крыўды, сумнае і агіднае, выхоўваць здаровы эстэтычна-мастацкі густ, сцвярджаць гуманістычныя народныя ідэалы. Праз казку дзеці дакранаюцца да жыцця, культуры, быту нашых продкаў. Казка дае маленькаму чалавеку першыя ўрокі патрыятызму і маралі, вучыць суперажываць, не быць абыякавым да чалавечага гора, пакут.

Народ – складальнік казак. Слухаючы казкі, дзіця ўспрымае яго, народа, думкі і пачуцці, узаемаадносіны. Вялікае яе выхаваўчае, пазнавальнае і эстытычнае развіццё. Казка дае дзіцяці гатовыя моўныя формы, моўныя характарыстыкі, вобразы, важна толькі правільна разумець іх і правільна навучыць дзіця імі карыстацца. Настае момант, калі дзіця хоча новых ураджанняў ад старой казкі, і тады яно прыдумвае для яе новы канец, надзяляючы героя новымі ўласцівасцямі, што садзейнічае развіццю ў дзіцяці звязнага маўлення, уменне падбіраць словы з падобным альбо супрацьлеглым значэннем.

Слухаючы казку, дзіця дашкольнага ўзросту праяўляе асаблівую ўнутраную актыўнасць, становіцца як бы ўдзельнікам апісваемых і ўспрымаемых падзей, і наогул забяспечвае для сябе багатае моўнае асяроддзе.

Таму так важна сумесна з дзіцём абыграць, інсцэнізаваць прачытаную казку ці ўрывак з казкі для непасрэднага авалодвання дзіцём звязнага маўлення, яго выразнасці і вобразнасці, а таксама развіцця пазнавальных працэсаў , такіх як успрыманне, памяць, мысленне, мова, уяўленне.

У дашкольным узросце адбываецца фарміраванне здольнасцяў дзіцяці да ўспрымання і разумення мастацкай літаратуры і менавіта казка рыхтуе яго да гэтага.

У казках адлюстроўваецца барацьба за справядлівасць, мары аб лепшым жыцці. Беларускія народныя казкі ў большасці сваёй вызначаюцца высокай мастацкасцю, вострай крытычнай накіраванасцю супраць сацыяльнай несправядлівасці.

***Шануйце і любіце родную мову!***
***Як мага часцей чытайце дзецям беларускія народныя казкі, папаўняйце сямейную бібліятэку гэтым найбагацейшым скарбам нашага народа.***

В.Н. Кур’ян, выхавальнік

**Дадатак 5**

# Падарожжа у чароўную краіну

# “Вяселкі”



**План правядзення сустрэчы:**

1. Знаёмства з бібліятэкай бацькоўскага пакоя.
2. Інфармацыя аб часопісе “Вясёлка”.
3. Мультымедыйны паказ “Бібліятэка часопіса “Вясёлка”.

(праект часопіса “Вясёлка” разам з выдавецтвам “Адукацыя і выхаванне” )

4. Мультымедыйны паказ беларускай народнай казкі “Пиліпка”.
5. Выстава часопісаў для самастойнага прагляду дзецьмі.
6. Афармленне інфармацыйнага лістка для бацькоў “Чытаем “Вясёлку” разам з дзецьмі”

(зняты на Беларусьфільме Таццянай Кубліцкай, Гран - пры конкурсу анімацыйных фільмаў 10 Міжнароднага дабрачыннага кінафестывалю (Прамяністы анёл”)

1. Добры дзень. Гэта першае слова, якое мы гаворым пры сустрэчы. Згодны? Сёння я з вялікім задавальненнем , ад шчырага сэрца гавару вам:

“Добры дзень, нашы будучыя чытачы”. І хачу вас запрасіць у падарожжа ў краіну знаўцаў. Дзеці, як вы думаеце, ці можна, не выходзячы з дзіцячага садка, не ўстаючы з месца, без чараўніцтва, папасці ў іншую краіну, паназіраць за Калабком, Чабурашкай, убачыць іншых казачных герояў?
Што гэта за краіна, хто там жыве? Гэта вельмі цудоўная краіна, у якой жывуць вашы і мае сябры. А народ у ей – сапраўдныя знаўцы. Сярод іх няма ніводнага, які не змог бы расказаць кожнаму з нас што-небудзь цікавае і карыснае, вясёлае і смешнае. Што б вас ні зацікавіла, тут заўжды знойдуцца цікавыя субяседнікі. Што ж гэта за краіна?
БІБЛІЯТЭКА. А жыхары гэтай краіны – кнігі і часопісы. Вы ўжо пазнаёміліся а Азбукай, вучыцеся чытаць. Кнігі і часопісы чакаюць той час, калі вы адкрыеце іх старонкі.
А зараз я запрашаю вас пазнаёміцца з бібліятэкай бацькоўскага пакоя. Няхай яе памеры невялікія, кніг і часопісаў, менавіта, намнога менш, чым ў звычайнай бібліятэцы, але я магу вас заверыць, што яны з нецярпеннем чакаюць сваіх чатачоў. І кожны з вас можа ім стаць.
*Знаёмім выхаванцаў з літаратурай, якая размешчана ў бібліятэцы. Звяртаем ўвагу на “Просьбу кнігі” (асноўныя правілы карыстання кнігай, бібліятэкай).*
2.Мультымедыйны паказ “Бібліятэка часопіса “Вясёлка”.
(праект часопіса “Вясёлка” разам з выдавецтвам “Адукацыя і выхаванне” )
3.Мультымедыйны паказ беларускай народнай казкі “Пілiпка”.
4. Знаёмства з выставай часопісаў “Вясёлка” (самастойны прагляд).



**5. Размяшчэнне інфармацыйнага лістка для бацькоў "Чытаем "Вясёлку" разам з дзецьмі" на інфармацыйных стэндах у групах**

*У апошні час культура чытання перыядычных выданняў у сем'ях значна страчана. Ды і не ўсе бацькі ведаюць аб існаванні мноства часопісаў для дзяцей. Тым не менш, разнастайнасць друкаваных выданняў дастаткова вялікая, і ахапіць іх усе ў нашым маленькім аглядзе немагчыма. Па гэтаму, сення мы звяртаем вашу ўвагу на адзін з іх - часопіс "Вясёлка".*

**Паважаныя бацькі!**

**У вас ёсць магчымасць пазнаёміць сваіх дзяцей з чароўным светам "Вясёлкі"**

*Часопіс "Вясёлка" пачынае сваю гісторыю з далёкага 1957 года. Часы мяняюцца. А часопіс застаецца.*

**Часопіс "Вясёлка" – ГЭТА:**

-літаратурны часопіс для дзецей 3-5 гадоў, выходзіць 1 раз у месяц;

-у часопісе друкуюцца вершы, беларускія казкі, казкі народаў свету, апавяданні, забаўлянкі, калыханкі, лічылкі, рэбусы, цікавыя і карысныя звесткі;

-часопіс спрыяе развіццю дзяцей, прывівае ім любоў да Радзімы, роднай мовы, далучае да творчасці (у рэдакцыю чытачы прысылаюць асабістыя вершы, казкі, а яшчэ малюнкі).

**Запрашаем Вас наведаць бацькоўскі пакой і карыстацца часопісам "Вясёлка" для дамашняга чытання з дзецьмі.**

**Спадзяёмся, што інфармацыя аб часопісе будзе карыснай і запатрабаванай Вамі.**

Н.Н. Якімчык, педагог сацыяльны
В.Н. Кур'ян, выхавальнік

**Дадатак 6.**

# Як казу званочак спас

***<u>Аўтары: сям’я Эвеліны Дарагой</u>***



Жыла была Каза-Егаза. Жыла не тужыла . Дзед і баба любілі казу.



Яна пасвілася на лузе . Ела духмяную траву .
На шыі ў яе быў званочак , ён звінеў і дзед з бабаю ведалі, што каза каля хаты .
Надакучыла казе жыць у бабы з дзедам і яна захацела паглядзець свет .



Каза ішла , ішла і зайшла ў лес .
Вось бяжыць зайка. Спыніўся і пытае ў казы :
— Ты хто ?
—Я Каза-Егаза чатыры нагі два рагі. Збегла ад бабы, ад дзеда , каб свет паглядзець.Пайшлі разам .

—Не, каза, мяне  дзеткі зайчаняткі чакаюць. І ён  пабег.
А тым часам  каза — скок-скок! — Далей  пайшла.
Вось  бяжыць  вожык. Спыніўся  і  пытае ў  казы :
— Ты хто ?
—Я  Каза-Егаза  чатыры нагі два рагі.  Збегла ад бабы ад дзеда , каб  свет  паглядзець.Пайшлі  разам .
—Не, каза, мяне  дзеткі  важаняткі чакаюць . І ён  пабег.
А тым часам  каза — скок-скок! — Далей  пайшла.
Вось  бяжыць  вавёрка. Спынілася  і пытае ў  казы :
— Ты хто ?
—Я  Каза-Егаза  чатыры нагі  два рагі.  Збегла ад бабы ад дзеда , каб  свет  паглядзець.Пайшлі  разам .
—Не ,каза, мяне  дзеткі  малыя  чакаюць.  І  яна  пабегла.
А тым часам  каза — скок-скок! — Далей  пайшла.
Вось  бяжыць  воўк. Спыніўся  і пытае ў  казы :
— Ты хто ?
—Я  Каза-Егаза  чатыры нагі два рагі.  Збегла ад бабы, ад дзеда , каб свет  паглядзець.Пайшлі  разам .
—А я Воўк-зубами  шчоўк, і   я цябе з ‘ем!
Спалохалася   каза   і ўцякаць . Каза бяжыць , а  званочак звініць .
Тым  часам  дзед з бабай  убачылі , што казы няма, і пайшлі  яе  шукаць .
Тут   раптам  яны   ўчулі, як звініць званочак,   і  пабеглі  у  лес.
І вызвалілі  казу  ад  зубоў  воўка .
З  таго часу  Каза-Егаза  жыла з  дзедам і бабай, духмяную траву ела і  гора не ведала.

Тут  і  казцы  канец, а  хто  слухаў  -  маладзец  !

**Дадатак 7**

# Музычная забава «Муха - пяюха на новы лад».

Пачатак забавы ў фізкультурнай зале.
Гучыць ціха беларуская народная музыка.
Выходзіць Казачніца (у беларускім адзенні).
Казачніца. Добры дзень, мае маленькія сябры! Я казачніца, прыйшла казкі баіць. А ці любіце вы казкі? А якія беларускія казкі вы ведаеце, назавіце іх (адказы дзяцей)
Утульненька сядайце, адзін аднаго не штурхайце.
Музычную казку «Муха - пяюха на новы лад» вам пакажа дзіцячы сад.

Жыла-была муха-пяюха (муха выходзіць, спявае, танцуе пад музыку).
Муха (пяе) - Чаму ж мне не пець? Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатачцы парадак ідзець.
Я муха –пяюха - спяваю і танцую.
Люблю я гулянкі. С суседзямі сябрую.
Казачніца - Мела муха каляску і трох камароў (камары ляцяць пад музыку, танцуюць). Запрэгла муха-пяюха камароў у каляску, ды паехала на гулянку. Едзе яна дарогаю, едзе шырокаю – бачыць, нехта бяжыць …
Хор (спявае) – Бегла мышка па дарожцы,
Падарунак несла кошцы.
Не смятану, не аладкі,
А пшанічныя зярняткі.
Прыпеў - Пі, пі, пі. Мяў (2разы).
2. Кошка есці іх не ўмела.
Мышку з’ есці захацела.
А пасля паразважала,
З мышкаю пасябравала.
3. Пра ўчынак мудрай кошкі
Вы паслухайце хоць трошкі.
І дарослыя, і дзеці перад тым,
Як нешта з‘есці.
Прыпеў -Пі, пі, мяў. Вось так!
Мышкі- Добры дзень, пані!
Кошка - Як пані зваць-велічаць?
Муха - Я муха-пяюха. А вы хто?
Мышкі (разам) - Я мышка на паліцах скрабатуха.
Кошка - А я кошка чысцюха.
Муха - Сядайце, паедзем разам.
-Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю, пад’язжаюць да балота – а там…
**“Танец лягушкі з песняй.”**
Лягушка –Вось я якая царэўна лягушка.

Вось я якая прыг -паскакушка.
Ква –ква! Ква – ква! Песня мая.
- Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?
- Муха-пяюха. Кошка чысцюха. Па паліцах скрабатуха. А ты хто?
- А я па сажалках рагатуха. Ква!
- Сядай, паедзем разам.
Едуць яны дарогаю, едуць яны шырокаю…Раптам…
Хор (спявае). Па галінках скок ды скок.
Скача вельмі лоўка,
Грыб нясе ў свой дамок
Рыжая вавёрка.
Да, да, да, да рыжая вавёрка.
- Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?
- Муха-пяюха. Кошка чысцюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. А ты хто?
- А я па елках скакуха.
- Сядай, паедзем разам.
Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю, а насустрач ім…
**(“ Танец зайца”).**
- Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?
- Муха-пяюха. Кошка чысцюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. А ты хто?
- А я звярок – прыг - скок.
- Сядай, паедзем разам.
Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю - а насустрач нехта коціцца.
Вожык (спявае) Тупу, тупу, тупу, туп,
Я калючы, востры зуб!
А я ножкамі туп-туп!
А я вочкамі луп-луп!
Чую, чую - усюды ціш,
Чу!.. Скрабецца ў возе мыш!
Вожык - “Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?
- Муха-пяюха. Кошка чысцюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. Прыг скок. А ты хто?
Вожык - Я вожык туп, туп.
Усе разам - Сядай з намі, вожык,
Пашкадуй ты ножак,
Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю - ідзе воўк.
(**Музыка воўка гучышь “Танец ваўка**”).
Воук - “Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?
- Муха-пяюха. Кошка - чысцюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. Прыг скок. Тупу, туп. А ты хто?
- А я галодны воўк – зубамі шчоўк! Усіх вас з’ем.
Пачулі гэта камары, падняліся ўгору разам з каляскай. Пачалі воўка кусаць. А галодны воўк ад страху заляскаў зубамі і .. ўцякаць у лес.

Казачніца: – Вось і казачцы  канчына. А хто слухаў – малайчына!
Прадстаўленне герояў казкі**.**
-А зараз запрашаю на гулянку на падворак  Міхася Патапавіча (пераходзяць у музычную залу).
Мядзведзь Міхась –Добры  дзень вам, людзі добрыя! Госці званыя!
Вас у госці запрашаю. Весяліцца дазваляю!
Мядзведзіха – Ой, музыка, рэж за двох,
Не шкадуй ты маіх ног,
Мае ногі не баляць.
Яны хочуць танцаваць.
**“Полька ў крузе” бел. нар. муз.**
Казачніца –Чуйце, хлопчыкі, дзяўчаткі!
Прапаную вам загадкі.
Для гульні цікавай, новай –
Трэніроўкі разумовай.
Ты загадку адгадай,
А адгадку вось у гэтым чароўным куфры адшукай.
1. З ліпы звіта дзіравае карыта.
По дарозе ідзе, клеткі ўслед кладзе (лапці).
- З лапцямі мы пагуляем у гульню “Міхась”. Лапці раскладваюць па крузе. Вакол іх становяцца  дзеці. Усе разам гавораць такія словы:
- Ты, Міхаська, не зявай! Лапаточкі абувай!

Гучыць беларуская народная музыка, дзеці рухаюцца па крузе. Міхаць забірае 3 – 4 лапці. З канцом музыкі дзеці стараюцца стаць на лапаць, каму не хапіла –выбывае з гульні.

2. У зямлі нарадзіўся, на кружані вярцеўся,
На агні пекся. На кірмашы быў –людзей карміў.
Калі ўпаў, дык прапаў, ніхто не падабраў (гарлачык) Хто адгадвае загадку, дастае гарлачык з лыжкаю з куфра і становіцца вядучым гульні.
- Зараз прапаную пагуляць у гульню ”Гарлачык”.  Вядучы гульні бярэ гарлачык з лыжкай. Дзеці становяцца ў круг. Вядучы  ходзіць каля дзяцей. Усе спяваюць
-За гарлачык гэты дай нам зусім крышку.
Каб ніколі не хварэць маннай кашы лыжку.
Вядучы спыняецца каля 2 дзяцей, яны становяцца спінамі  адзін да другога. Усе лічаць:1, 2, 3 – бяжы! Двое бягуць у розныя бокі па крузе. Хто першым схопіць лыжку з гарлачыка – той пераможца.
3. Маці кветкі звівала. На галоўку дачушцы клала.
Каб дачушка прыгажэйшая стала. (Вянок).
Казачніца. -7 вяночкаў раскладаю. Заспяваць усіх запрашаю “Купалінку”.
Танец “Купалінка”бел.нар. мел.
4. Пер’я наелася, у кашулю адзелася.
І спіць у ахвоту начная істота.
Ляжыць, дзе і ты: 4 рукі, 2 жываты (падушка).
- Я да куфра падышла і падушачку знайшла.

- Прапаную пагуляць у гульню “Падушачка”.

Усе становяцца у круг, перадаюць падушачку па крузе і спяваюць:

“Падушачка, падушачка мая пухавая.
Дзяўчыначка, дзяўчыначка мая ўдалая.
Каго люблю, каго люблю – таго пацалую.
Падушачку, падушачку - таму падарую” (У каго падушачка –запрашая сябра, ці сяброўку. Танцуюць. З канцом музыкі становяцца каленямі на падушачку, абдымаюцца).

Казачніца –Пагулялі, паспявалі. Яшчэ мацней пасябравалі.
А зараз запрашаю ўсіх устаць і ў аркестры ўсім разам сыграць.

Аркестр іграе беларускую народную мелодыю “Бульба”.

Казачніца -Народ беларускі - гасцінны народ.
І любіць прыгожыя святы,
Дзе столькі вяселых, цудоўных прыгод,
Дзе стол накрываюць багаты.

–Міласці просім у кафэ “Журавінка”пачаставацца стравамі беларускай кухні і кісялём з журавін (пераходзяць у бацькоўскі пакой).

У канцы свята ўсе ўдзельнікі па чарзе.

- Мы верым, што звычаі нашы не ўмруць,
Майстэрства народа не стухне.
- Няхай жа традыцыі нашы жывуць
У песнях, ў казках і ў кухні.
- Дзякуй вам, светлыя людзі!
Няхай раніца добрай будзе!
Сонейка ў небе вам ярка свеціць,
-І радуюць вас кветкі і дзеці!
- Усім вам - вялікі дзякуй!
- Шчасця, радасці, цярпення
- І, вядома, усім здароўя.
Разам - а на тым – да пабачэння!

В.В.Кернажыцкая, музычны кіраўнік
В.Н.Кур’н, выхавальнік

**<u>Дадатак 8</u>**

# <u>Свята</u>
# <u>“У гасцях у беларускай казкі”</u>

*Мэта*: фарміраванне цікавасці да беларускай народнай казкі, як сродка выхавання дзіцяці.

*Задачы*: дапамагчы ўспомніць знаёмыя беларускія казкі, перадаць пачуццё радасці ад сустрэчы з казкай; узбагачаць слоўнікавы запас дзяцей народнымі прыбауткамі, жартамі, развіваць уменне адгадваць загадкі; развіваць памяць, мысленне, тэатральна-музычныя здольнасці, рухальную актыўнасць; выхоўваць калектывізм, пачуццё ўзаемадапамогі, любоў да свайго народа, сваёй краіны, да казкі, у якой ўвасоблены традыцыі беларускай народнай творчасці, на матэрыяле беларускага народнага фальклору паказаць прыгажосць гучання беларускай мовы.

*Прадметнае асяроддзе*: зала ўпрыгожана ў народным стылі; дэкарацыі для інсцэнізацыі казак (макеты дрэў, казачная хатка і інш.), касцюмы казачных герояў (Лісы,Ката, Пеўніка, Барана, Мядзведзя, Ваўка, Пчолкі , Бабы Ягі); беларускі нацыянальны касцюм (жаночы і мужчынскі); цацкі для гульні “Хто згубіў рэчы?” (яйка, каласок, лапаць, пянек з сякеркай, бобінка); выстава беларускай казкі ( дабрачынная акцыя “Бацькі-дзецям”- кніжкі-самаробкі, кніжкі з серыі “Беларуская народная казка”); на сцяне развешаны творчыя работы дзяцей з прыкметамі адоранасці, бацькоў, педагогаў “У гасцях у беларускай казкі”.

Ход свята.

1. Кансультацыя па выніках анкетавання бацькоў “Роля беларускай народнай казкі ў жыцці дзіцяці” з *відэапаказам “Далучэнне да беларускай народнай казкі дома”, з прэзентацыяй кніжак-самаробак, атрыбутаў казкі, зробленай бацькамі сваімі рукамі*
2. Гучыць беларуская народная музыка, з прытопваннем, з падскокамі ўваходзяць у залу дзеці разам з Несцеркам і бабкай Ганкай).

<u>Бабка Ганка</u>: -Добры вечар ўсім, і дарослым, і малым, і старэнькім, і маладзенькім,і тоўсценькім і худзенькім, і дзядулям, і бабулям, і матулям, і татулям.

<u>Несцерка</u>:- Шмат казак ёсць на свеце, жывуць яны ўжо доўга-доўга. Няма на зямлі таго чалавека, які б іх не любіў. А што такое казка? (адказы дзяцей, бацькоў,гэта дзіва, гэта выдумка, гэта шчаслівае жыццё і інш.).

<u>Бабка Ганка: - </u>Сёння мы ўспомнім казкі, складзеныя беларускім народам. Але перш трэба адказаць, хто згубіў гэтыя рэчы, і назваць казку.

Гульня “Хто згубіў рэчы?” (яйка- “Курачка рабка”; каласок- “Пшанічны каласок”; лапаць – “Сынок з кулачок”; пянёк з сякерай – “Не сілай а розумам”).

Несцерка: - Які сёння ва ўсіх добры настрой! Гэта цудоўна! Я хачу таксама загадаць вам загадкі, а вы пастарайцеся іх адгадаць (спаборніцтва паміж дзецьмі і дарослымі).

Пытанні дзецям:

1. Хто ведае прыгожую назву нашай краіны ? (Беларусь)
2. Як называецца народны лялечны тэатр ? (Батлейка)
3. Як называецца казка, дзе два звяры аб'явілі адзін аднаму вайну ? ("Сабака і воўк")
4. Якія звяры спалохалі ката, які адправіўся ў лес на паляванне? (воўк, заяц, мядзведзь, дзік)
5. Успомнім беларускі горад, назва якога нагадвае героя казак? (Ваўкавыск)

Загадкі дарослым:

1. Маленькі шарык пад лаўкаю шарыць? ( мыш)
2. Лёг вусаты , а ўстаў гарбаты? (кот)
3. Ходзіць цар па градзе, носіць блін у барадзе? (певень)
4. Шапачка маленькая, камізэлька нятканая, кафтан рабенькі, ды ходзіць босенькі ? (верабей)
5. За лесам конь іржэ, а дадому не ідзе? (воўк)
6. Хто над намі дагары нагамі ? (муха)

Пытанні для ўсіх:

1. Яе ўсе баяцца трошкі, яна ў лесе хатку мае, і ў ступе лятае? Хто яна? (дзеці адгадваюць- баба Яга)

Бабка Ганка: - Аднойчы я калыхаю свайго ўнука ды і кажу яму:- "Спі, мой ўнучак, а то баба Яга ходзіць за сялом, трасе памялом, схопіць таго, хто не спіць". А ён як падскочыць, ды як закрычыццць: "Хачу пабачыць бабу Ягу!". А вы дзеці хочаце пабачыць бабу Ягу і пагуляць з ёю? Тады адгадайце, у якіх беларускіх народных казках жыве баба Яга? ("Пiлiпка сынок", "Цярэшка". (уваходзіць баба Яга – педагог-псіхолаг)

Баба Яга: - Кхе-кхе-кхе! Чую казку пра мяне. Вітаю ўсіх, хто з казкай сябруе, хто любіць прыгоды, зацеі і гульні (праводзіцца беларуская народная гульня "Баба Ёжка")

Баба Яга: - Запрашаю вас у падарожж па чароўнай краіне беларускіх народных казак ("Адгадай казку").

Дзіця: 1. Нам народ падарыў свае дзіўныя казкі, што пачуў ад бацькоў і заморскіх, і нашых.

2. Ад звяроў і дажджоў, ад далінаў і узгор'яў.
3. Ад снягоў і вятроў, і ад розных сузор'ў.

Бабка Ганка, Несцерка, баба Яга (разам):

Наша першая казка. Падказкай будзе загадка. .

Баба Яга: – Хто яго ведае,
Які гаспадар у лісіцы?
А што, калі ён нашага
Абеда не ўпадабае

І нас усіх сваім хвастом пазабівае?
(кот)
(інсцэнізацыя ўрыўка з казкі “Як кот звяроў напалохаў” - паказвае сям’я Мікіты Кавалевіча)
Наша другая казка.
Несцерка: - Загадваю вам загадку, якая падкажа, хто будзе героямі новай казкі.
Пеўнік добры быў,
Пусціў лісіцу ў хатку,
А яна яго цапнула і панесла,
Па лясах,па барах.
Аж пеўніка страх браў.
( “Коцік, пеўнік і лісіца”)
(паказ тэатра аднаго акцёра –бабуля Соні Паляжаевай, урывак з казкі)

Наша трэцяя казка.
Бабка Ганка: - А падказка - адгадай з якіх казак будуць танцаваць героі (выконваецца вясёлы танец “Кот і мышка” дзецьмі з прыкметамі адоранасці у музычным развіцці ) (казка “Муха-пяюха”, “Коцік, пеўнік і лісіца” )
Бабка Ганка: - Малайцы! Добра ведаеце казкі, а значыць, любіце, шануеце свой народ, сваю родную мову (дзеці выконваюць прыпеўкі).
1.На вясёлыя пасядзелкі
Сабраліся хлопцы, дзеўкі
Добра пець і танцаваць
Беларускую казку праслаўляць.

Прыпеў: Ой, татулі-трататулі,
Ну, дык слухайце матулі.

2.Пачынаем пець прыпеўкі
Просім не смяяцца,
Тут народу вельмі многа,
Можна ўсхваляваца.

Прыпеў: Ой, татулі-трататулі,
Ну, дык слухайце, татулі.

3.Горкай, горкай-горачкай
Ішоў малы Ягорачка.
І свістаў ён птушачкай
Птушачкай-пяюшачкай.

Прыпеў: Ой, татулі-трататулі,
Ну, дык слухайце, бабулі.

4.Бабка Ёўка, дзед Талаш
Сабіраліся на кірмаш.
Што павезлі прадаваць
Паспрабуйце адгадаць?

Прыпеў: Ой, татулі-трататулі,
Ну, дык слухайце, дзядулі.

5.Гэй, каза, збірай манаткі,
Уцякай хутчэй ты з хаткі.
Бо вунь дзед ідзе, ён касу нясе.

6.Тылі-тылі, скрыпіца
Тут сядзіць лісіца.
У лісіцы новы двор,
Сем дачушак на выбор.
Восьмы пеўнік-гэта мой!

Прыпеў: Ой, татулі-трататулі,
Ну дык слухайце ўсе.
Ой, татулі-тра-та-та,
Нам без казкі нікуда!

Размінка (“Асілкі”)- праводзіць кіраўнік фізічнай культуры ў касцюме міфалагічнага героя “Асілак” разам з дзяўчынкай з прыкметамі адоранасці у фізічным развіцці

Бабка Ганка: - Маня! Зоська! Ясь! Андрэйка! Ціт, Мікітка! Апанас!
Беларуская казка вітае вас! Вас і ўсіх нашых сяброў!
Ну вось, хлопчыкі, дзяўчынкі, матулі, татулі, бабулі, дзядулі,
Сядзем усе радком.
Дык паслухаем казачку не прастую і не залатую, вам знаёмую, народную, дык толькі з іншым пачаткам і канцом (інсцэнізацыя беларускай народнай казкі “Баран - бок абадран”- паказваюць дзеці )

(пад вясёлую беларускую народную музыку ўсе героі казак танцуюць, весяляцца, дарослыя пляскаюць у далоні)

Несцерка: - Вы так дружна рагаталі, што ўсе казкі пасябравалі. Пляскалі ў ладкі, адгадвалі загадкі!

Баба Яга: - Край свой любіце! Не таму любіце, што за ўсё цяплейшы, ці прыгажэйшы, а таму, што за ўсё мілейшы, за ўсё даражэйшы.

Бабка Ганка: - Дзякую шчыра, што не паснулі, што ад душы весяліліся, спявалі, скакалі, беларускую казку праслаўлялі!

Усе разам: - Але шкада, усё ж – бывайце, толькі нас не забывайце!

В.Н.Кур’ян, Г.Н.Панфілава, выхавальнікі

## ***Сюрпрызны момант: пачастунак ад курачкі з казкі “Пшанічны каласок”***

***Фотададатак да свята беларускай казкі па выніках рэалізацыі праекта***







## Заданне бацькам
## па выніках рэалізацыі праекта

1. Купіце кнігу з беларускімі казкамі.
2. Прачытайце беларускую казку для усіх членаў сям'і.
3. Пагутарыце па казцы на беларускай мове
4. Спытайцеся ў дзіцяці ці любіць яно беларускія казкі.
5. Дайце дзіцяці яшчэ раз пачуць яго любімую казку.
6. Пагаварыце аб свяце казкі, на якім вы былі.

**Дадатак 9**

**Інфармацыйны лісток да выставы “У гасцях ў беларускай казкі”, размешчанай на стэндзе “Наша творчасць” дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці**

# Казка - найбагацейшы скарб …

**Адным з важных шляхоў творчага пазнання рэчаіснасці з’яўляецца казка. Народныя казкі - найбагацейшы скарб, у іх увасоблены мудрасць, мастацкі талент народа, глыбокі роздум чалавека над жыццём, яго вопыт, назіранні за навакольнымі з’явамі.**

**Казка ўзнаўляе даўно забыты час і падзеі, своеасаблівы каларыт часу і жыццевай стыхіі, страчаныя ў памяці народа. Менавіта праз казку дзеці дакранаюцца да жыцця, культуры, быту нашых продкаў**

**Казка дае малому чалавеку ўрокі патрыятызму і маралі. Усім сваім патрыятычным ладам яна вычыць дзяцей разумець народнае ўяўленне пра добрае і злое, высокае, сумленнае і агіднае, нізкае, гуманнае і жорсткае.**

***Паважаныя дарослыя!***

**Давайце дзецям магчымасць пазнаваць свет не толькі розумам, але і сэрцам**

# Выстава – загадка

## “У гасцях у беларускай казкі” –

**Сумесная творчая дзейнасць**
**выхаванцаў старэйшай “Б” групы, іх бацькоў,**
**выхавацеляў Кур’ян В.Н., Панфілавай Г.Н.**

# Увага! Увага!

***А ВЫ здагадаліся з якой казкі гэтыя цікавыя казачныя персанажы?***


НАШЕ ТВОРЧЕСТВ

**Цікава працаваць у цэнтры “Вяселы аловак”**

**Казка нібы сама ажывае**

*Дадатак 10*

# <u>Выказваем шчырую падзяку!</u>



***Маме Арцёма- Вользе Сяргееўне Блажыеўскай, маме Мікіты- Валерыі Уладзіміраўне Кавалевіч, тату Арсенія - Юрыю Станіслававічу Якалцэвічу за актыўны ўдзел у папаўненні бібліятэкі групы беларускай казкай. Вашы кніжкі, зробленыя сваімі рукамі, прынеслі дзецям вялікую радасць.***

***Дзякуем за тое, што дапамагаеце дзецям любіць, разумець беларускую народную казку!***

**З любоўю і павагай да вас выхавальнікі групы і дзеці.**

# Пачынаюцца нашыя казкі,

# заплятаюцца нашыя казкі...



***Казка зноў вяртаецца да нас!!!***

***І мы запрашаем вас,***

# ПАВАЖАНЫЯ БАЦЬКІ,

***<u>на свята беларускай казкі</u>***

***Чакаем вас***

***з усмешкаю, весялосцю, з жаданнем слухаць беларускую гаворку***

**<u>ў пятніцу, у 17 $^{00}$ гадзін.</u>**

# Казка сваімі рукамі!

Чароўныя рукі

***Агнэсы Чаславаўны Блыш***

**падарылі дзецям любімых казачных герояў беларускай народнай казкі "Баран- бок абадран."**

**Вялікі  дзякуй Вам,**

***Агнэса Чаславаўна,***

**за Вашу фантазію, творчасць, за тое, што Вы заўсёды з намі.**

**Творчыя работы, зробленыя Вамі, захапляюць не толькі дзяцей, але і дарослых.**



***З любоўю і павагай да Вас выхавальнікі групы, дзеці***

# А я умею сачыняць.

З такой упэўненасцю сказала

**Эвеліна Дарагая**

і працягнула выхавальніку кніжку з малюнкамі.

А там - казка "Як казу званочак спас."

Гэта Эвеліна сумесна з мамай і татам прыдумалі такую казку і падабралі да яе малюнкі.

*Дзякуй вам, паважаныя*

**Алена Мікалаеўна,**

**Віталій Сяргеевіч**

за выхаванне ў сваей дачкі любові і павагі да беларускай казкі, да роднай мовы.



З любоўю і павагай
да вас
выхавальнікі
группы
і дзеці.

# Фотададатак

## да праекту “У гасцях у беларускай казкі”

### Кніжкі – самаробкі ад бацькоў

### Размалёўкі ад мамы Арцема Блажыеўскага




# Казачныя гульні з педагогам - псіхолагам



# Казачныя гульні з педагогам - псіхолагам




Дзеці - дзецям:пераказ казкі "Як кот звяроў напалохаў"



Тэатр аднаго акцёра: казка ад Эвеліны "Коцік, пеўнік і лісіца"



Мікіта Кавалевіч: прэзентацыя кніжкі - самаробкі "Баран - бок абадран"



"Пшанічны каласок" ад Якалцэвіча Ю.С.



Казка сваімі рукамі ад мамы Улада Блыша



"Зайкава хатка" ад сям'і Блажыеўскіх

# Ад аўтара праекта.




***Любіце беларускія казкі, любіце мову, на якой яны напісаны. Цаніце гэты вялікі народны скарб. Бо ён дапамагае быць сціплым, разумным, спагадлівым, удзячным…***

**Вольга Кур'ян**